✓**26 мая** ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адкрылася выстава **«100 рарытэтаў: ад гістарычных кнігазбораў да сучасных арт-кніг»**, прысвечаная гісторыі фарміравання фонду Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. На ёй прадстаўлены найбольш значныя і каштоўныя ўзоры беларускай і сусветнай кніжнай спадчыны, назапашанай бібліятэкай за 100 гадоў. Фонд галоўнай бібліятэкі краіны на сённяшні дзень налічвае больш за 10 млн экзэмпляраў дакументаў. У гэтым багацці ведаў вылучаецца сваёй унікальнасцю калекцыя рукапісных і друкаваных выданняў XV – пачатку XXI ст., якая пачала фарміравацца адначасова з заснаваннем бібліятэкі ў 1922 г. У яе аснову ўвайшлі былыя магнацкія і шляхецкія бібліятэкі, бібліятэчныя зборы розных устаноў, прыватныя кнігазборы вядомых дзея-

чаў культуры, мастацтва, навукі і г.д. Асноўныя раздзелы экспазіцыі пазнаёмяць наведвальнікаў з калекцыямі рукапісаў, інкунабулаў, палеатыпаў, старадрукаваных кніг XVI – XVIII стст., рэдкіх кніг XIX – пачатку XXI ст. Выстава дэманструе эвалюцыю кнігі і фондаў бібліятэкі. Тут можна пабачыць кнігі на розных матэрыялах, пачынаючы з гліняных таблічак, пальмавых лістоў, пергаменту і заканчваючы паперай; і ў розных формах: ад скрутка да кодэкса. Шэраг асобнікаў экспануецца ўпершыню.

Выстава працуе да 31 снежня.


МУЗЕЙ КНІГІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСІ
100
РАРЫТЭТАЎ:
АД ГІСТАРЫЧНЫХ КНІГАЗБОРАЎ
ДА СУЧАСНЫХ АРТ-КНІГ
СТАРАЖЫТНЫЯ, РЭДКІЯ І НЕЗВЫЧАЙНЫЯ ПОМНІКІ
КНІЖНАЙ КУЛЬТУРЫ З ФОНДАЎ БІБЛІЯТЭКІ
26 МАЯ 2022–31 СНЕЖНЯ 2022
НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ.
ПРАСП. НЕЗАЛЕЖНАСЦІ, 116